# Справаздача аб свабодзе веравызнання па краінах свету за 2006 год

Кароткі змест

Падрыхтавана Бюро Дзяржаўнага дэпартамента ЗША па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы.

Штогадовая справаздача

Мэта гэтай справаздачы – задакументаваць дзеянні тых урадаў, якія прыгнятаюць рэлігійнае самавыражэнне, праследуюць бязвінных вернікаў або дапускаюць насілле супраць рэлігійных меншасцяў, а таксама тых урадаў, якія паважаюць, абараняюць і падтрымліваюць свабоду веравызнання. Мы імкнемся ў роўнай ступені паведамляць пра парушэнне правоў вернікаў усіх рэлігійных плыняў і веравызнанняў. У справаздачы гаворка ідзе пра ўрады самага рознага кшталту, пачынаючы ад тых, што забяспечваюць высокую ступень абароны свабоды веравызнання ў самым шырокім сэнсе (якія “ў цэлым паважалі” свабоду веравызнання), і заканчваючы таталітарнымі рэжымамі, якія імкнуцца кантраляваць рэлігійную думку і самавыражэнне і расцэньваюць некаторыя або ўсе рэлігійныя групы як пагрозу.

Падтрымка і абарона свабоды веравызнання з’яўляецца адной з галоўных мэтаў знешняй палітыкі ЗША і ўваходзіць у групу задач Дзяржаўнага дэпартамента. Адданасць ЗША свабодзе веравызнання і міжнародным стандартам правоў чалавека таксама падрабязна выкладзена ў такіх дакументах, як Артыкул 18 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, якая гаворыць, што кожны мае права на свабоду думкі, сумлення і веравызнання. У знак выражэння нашай глыбокай нацыянальнай прыхільнасці гэтым свабодам Дзяржаўны дэпартамент ажыццяўляе маніторынг праследаванняў і дыскрымінацыі па рэлігійных матывах па ўсім свеце, рэкамендуе і праводзіць адпаведную палітыку ў адносінах да краін і рэгіёнаў і распрацоўвае праграмы падтрымкі і абароны свабоды веравызнання. Сродкамі трансфармацыйнай дыпламатыі ЗША імкнуцца ва ўсім свеце падтрымліваць і абараняць свабоду веравызнання і сумлення як фундаментальнага права чалавека і як крыніцы стабільнасці для ўсіх краін. Пры гэтым ЗША імкнуцца дапамагаць маладым дэмакратыям у рэалізацыі свабоды веравызнання і сумлення, дапамагаць рэлігійным і праваабарончым недзяржаўным арганізацыям падтрымліваць і абараняць свабоду веравызнання, а таксама выяўляць і заахвочваць змены ў палітыцы і дзеяннях рэжымаў, якія сурова праследуюць сваіх грамадзян або грамадзян іншых краін па рэлігійных матывах.

Бальшыня людзей у свеце маюць рэлігійныя перакананні, якімі яны даражаць. Гэта звязана з тым, што рэлігія займае настолькі важнае месца ў жыцці людзей, што многія лічаць свабоду веравызнання важнейшым з правоў. У той самы час глабальныя тэндэнцыі, рэгіянальныя адрозненні, мясцовыя перавагі і асабістыя гісторыі часта прыводзяць да важнай узаемазалежнасці паміж рэлігійнай прыналежнасцю і нацыянальнасцю, класавай прыналежнасцю, прыналежнасцю да

моўнай групы або адстойваннем пэўных палітычных поглядаў. Права на свабоду веравызнання можа быць парушана самымі рознымі спосабамі як яўна, так і ў завуаляванай форме. Выкладзеная ніжэй тыпалогія з'яўляецца далёка не вычарпальнай, але вызначае асноўныя віды парушэнняў, апісаных у гэтым дакладзе, і можа паслужыць карысным кіраўніцтвам для ацэнкі тэндэнцый у сферы свабоды веравызнання: таталітарныя і аўтарытарныя рэжымы, варожасць дзяржавы ў адносінах да мінарытарных рэлігій, нежаданне дзяржавы заўважаць сацыяльную дыскрымінацыю, дыскрымінацыйнае заканадаўства, якое аддае перавагу мажарытарным рэлігіям, а таксама асуджэнне некаторых рэлігій як культаў.

Парушэнні першай і найбольш сур'ёзнай катэгорыі назіраюцца пры таталітарных і аўтарытарных рэжымах, якія імкнуцца кантраляваць рэлігійную думку і самавыражэнне. Такія рэжымы расцэньваюць некаторыя або ўсе рэлігійныя групы як ворагаў дзяржавы праз іх рэлігійныя погляды або іх незалежнасць ад цэнтралізаванай улады. Некаторыя ўрады настроены варожа і рэпрэсіўна ў адносінах да канкрэтных груп, часта ідэнтыфікуючы іх як "пагрозу бяспецы". Важна адрозніваць групы вернікаў, якія выражаюць законную палітычную незадаволенасць, і тыя групы, што выкарыстоўваюць рэлігію для апраўдання гвалту супраць іншых рэлігійных груп або дзяржаў. У гэтай справаздачы шырокае падаўленне ўрадам рэлігійнага самавыражэння мірнага насельніцтва, што выконвае рэлігійныя абрады, нібыта з прычыны бяспекі кваліфікуецца як парушэнне свабоды веравызнання. Напрыклад, вайна з тэрарызмам не павінна выкарыстоўвацца як апраўданне падаўлення мірнага выканання рэлігійных рытуалаў. У справаздачы таксама звяртаецца ўвага на тыя краіны і сітуацыі, у якіх празмерна актыўныя дзеянні, прадпрынятыя ўладамі супраць вернікаў, што падазраюцца ў экстрэмізме, аказалі сур'ёзны абмежавальны ўплыў на свабоду веравызнання. Напрыклад, у некаторых краінах многія людзі баяцца часта наведваць мячэці, каб улады не прылічылі іх да рэлігійных экстрэмістаў.

Парушэнні другой катэгорыі адбываюцца там, дзе дзяржава варожа настроена ў адносінах да мінарытарных і недазволеных рэлігій. Улады такіх краін праводзяць палітыку, накіраваную на тое, каб прымусіць вернікаў адрачыся ад сваёй веры, вымусіць членаў рэлігійных груп уцякаць з краіны або запужаць і падвергнуць праследаванням пэўныя рэлігійныя групы. У справаздачы адзначаюцца выпадкі, калі рэпрэсіі дзяржавы супраць рэлігійных груп былі звязаны з этнічнай прыналежнасцю ў сувязі з тым, што ўрад, у якім дамінуюць прадстаўнікі мажарытарнай этнічнай групы, прыгнятаў рэлігію той ці іншай мінарытарнай групы. Акрамя таго, у справаздачы апісаны выпадкі, калі ўлады на падставе рэлігійных перакананняў таго ці іншага грамадзяніна рабілі выснову пра яго палітычныя погляды, што прыводзіла да застрашвання і праследавання асобных рэлігійных груп.

Парушэнні трэцяй катэгорыі вынікаюць з нежадання ўрада змагацца з сацыяльнай дыскрымінацыяй або злоўжываннямі ў грамадстве ў адносінах да асобных рэлігійных груп. У гэтых краінах можа існаваць заканадаўства, якое забараняе дыскрымінацыю і праследаванне па рэлігійных матывах, але дзяржаўныя чыноўнікі

не прадухіляюць канфлікты, праследаванні ці іншыя шкодныя дзеянні супраць мінарытарных рэлігійных груп. Для абароны свабоды веравызнання недастаткова проста наяўнасці “добрых” законаў, выкладзеных на паперы. Для гэтага патрэбна актыўная праца органаў дзяржаўнай улады ўсіх узроўняў па папярэджанні парушэнняў з боку дзяржаўных і прыватных арганізацый і асоб, па здзяйсненні правасуддзя ў адносінах да парушальнікаў і – у тых выпадках, калі гэта дарэчна, - прадстаўленне кампенсацыі ахвярам. Урады нясуць адказнасць за забеспячэнне таго, каб іх прадстаўнікі не парушалі свабоду веравызнання, а таксама за абарону свабоды веравызнання ўладай закону такім чынам, каб забяспечыць павагу да гэтай свабоды з боку прыватных арганізацый і асоб. Акрамя таго, урады павінны падтрымліваць абстаноўку павагі і цярпімасці ў адносінах да ўсіх людзей. У гэтай справаздачы апісаны выпадкі, калі ўрад не папярэджваў парушэнні свабоды веравызнання або не рэагаваў паслядоўна і энергічна на парушэнні свабоды веравызнання прыватнымі арганізацыямі і асобамі, няўрадавымі структурамі або супрацоўнікамі мясцовых праваахоўных органаў.

Да чацвёртай катэгорыі  адносяцца парушэнні, якія адбываюцца тады, калі ўрады прымаюць дыскрымінацыйныя законы і праводзяць палітыку, што спрыяе мажарытарным рэлігіям і стварае перашкоды рэлігійным меншасцям. Нярэдка такая сітуацыя з’яўляецца следствам гістарычнага дамінавання мажарытарнай рэлігіі і прадузятасці супраць новых ці мінарытарных рэлігій. У шэрагу краін урады ўзялі на ўзбраенне ідэалогію, якая звязвае нацыянальнасць з той ці іншай канкрэтнай рэлігіяй, прыняўшы законы, што падтрымліваюць рэлігіі большыні і з’яўляюцца дыскрымінацыйнымі ў дачыненні да мінарытарных рэлігій. Хоць большая частка насельніцтва такой краіны мае магчымасць бесперашкодна выконваць рэлігійныя абрады, падобная сітуацыя не можа быць ахарактарызавана як сапраўдная свабода выбару рэлігіі і адпраўлення рэлігійных абрадаў. Акрамя таго, дзяржаўная падтрымка той ці іншай рэлігіі можа прывесці да ўвядзення абмежаванняў нават для вернікаў, якія належаць да мажарытарных рэлігій, калі ўлады будуць гвалтоўным чынам насаджаць нейкую адну з інтэрпрэтацый гэтай рэлігіі.

Нарэшце, практыка дыскрымінацыі пэўных рэлігій шляхам класіфікацыі іх як небяспечных культаў або сект атрымала шырокае распаўсюджанне нават у тых краінах, дзе ў астатнім паважаецца свабода веравызнання. Напрыклад, у гэтай справаздачы абмяркоўваюцца абвінавачанні супраць мусульман-шыітаў у краінах з пераважна суніцкім насельніцтвам і наадварот. Асабліва ў тых выпадках, калі ўлады ўзялі на сябе функцыю рэгулявання веравызнання і рэлігійнай практыкі ў адпаведнасці з адной з гэтых рэлігійных традыцый.

У перыяд, ахоплены дадзенай справаздачай, з 1 жніўня 2005 года па 30 чэрвеня 2006 года, адбыліся самыя розныя падзеі, што паўплывалі на сітуацыю са свабодай веравызнання. Адной з тэндэнцый стала значнае павышэнне ўвагі міжнародных сродкаў масавай інфармацыі да праблем свабоды веравызнання і разыходжанне ў думках па дадзеным пытанні. Гэтыя змены ўключалі міжнародны пратэст у сувязі з перадрукоўкай серыі з дванаццаці сатырычных карыкатур на прарока Мухамеда,

якія першапачаткова апублікавала дацкая газета “Юландс-Постэн” у верасні 2005 года. Прымаючы рашэнне аб іх передрукоўцы, еўрапейскія СМІ спасылаліся на свабоду самавыражэння. Аднак многія назіральнікі, асабліва ў мінарытарных мусульманскіх абшчынах Еўропы, інтэрпрэтавалі гэта як непасрэдны выпад супраць ісламскай веры або як дэманстрацыю нецярпімасці да яе.

Наступны раздзел дакумента складаецца з дзвюх частак. У першай частцы коратка апісваюцца дзеянні, што прадпрымаў урад ЗША для падтрымкі і абароны свабоды веравызнання ў канкрэтных краінах, класіфікаваных як “краіны, што выклікаюць асаблівую заклапочанасць”, у сувязі з дапушчанымі імі сур’ёзнымі парушэннямі свабоды веравызнання. У другой частцы сцісла апісваецца сітуацыя ў тых краінах, у якіх свабода веравызнання ўяўляе значны інтарэс, у тым ліку ў краінах, што выклікаюць асаблівую заклапочанасць. Па кожнай краіне даецца характарыстыка прававой сітуацыі і адпаведнай палітыкі і прыводзяцца прыклады канкрэтных парушэнняў уладамі свабоды веравызнання. У бальшыні гэтых краін адзначаліся парушэнні свабоды веравызнання па меншай меры адной з апісаных вышэй катэгорый.

Частка I. Дзеянні ЗША ў адносінах да краін, што выклікаюць асаблівую заклапочанасць.

Закон аб свабодзе веравызнання ў краінах свету (ЗСВ) ад 1998 года прадпісвае правядзенне штогадовага аналізу сітуацыі са свабодай веравызнання па ўсім свеце і класіфікуе краіны, якія за справаздачны перыяд “здзейснілі або дапусцілі асабліва сур’ёзныя парушэнні свабоды веравызнання”, як “краіны, што выклікаюць асаблівую заклапочанасць”. Пасля такой класіфікацыі можа паследаваць перыяд перамоваў, на працягу якога ЗША будуць імкнуцца правесці працу з той ці іншай канкрэтнай краінай, каб дабіцца зменаў сітуацыі да лепшага. У далейшым, у залежнасці ад вынікаў гэтых перамоваў, дзяржаўны сакратар прымае рашэнне аб тым, якія дзеянні трэба прадпрыняць у адносінах да гэтай краіны ў адпаведнасці з азначаным законам. Гэтыя дзеянні вар’юючца ў дыяпазоне ад увядзення санкцый да заключэння пагадненняў і адступлення ад патрабаванняў. У адносінах да тых краін, супраць якіх ЗША ўжо ўвялі санкцыі раней, дзяржсакратар можа прадпісаць выкарыстанне адной або некалькіх з гэтых санкцый для забеспячэння выканання патрабавянняў азначанага закона і іншых законаў ЗША. Амбасадар па асобых даручэннях па пытаннях свабоды веравызнання ва ўсіх краінах свету і яго бюро на працягу ўсяго года прадпрымаюць дзеянні для падтрымкі і абароны свабоды веравызнання ў кожнай краіне, што выклікае асаблівую заклапочанасць. У гэтым раздзеле завастраецца ўвага на дзеяннях іншых супрацоўнікаў урадавых устаноў ЗША па падтрымцы і абароне свабоды веравызнання і заахвочванні ўрадаў да прыняцця пазітыўных захадаў з мэтай пашырэння свабоды веравызнання. У лістападзе 2005 года дзяржсакратар зноў класіфікавала як краіны, што выклікаюць асаблівую заклапочанасць, Бірму, Вьетнам, Кітай, Іран, Саудаўскую Аравію, Паўночную Карэю, Судан і Эрытрэю. Больш падрабязную інфармацыю ў адносінах такіх і іншых краін можна знайсці ў раздзеле, прысвечаным кожнай канкрэтнай краіне.

Бірма

Кожны год, пачынаючы з 1999, дзяржаўны сакратар класіфікуе Бірму як краіну, што выклікае асаблівую заклапочанасць. У 2005 годзе дзяжсакратар працягвала прызначаць санкцыі, што ўключалі забарону на экспарт або іншыя перамяшчэнні абаронных вырабаў і абаронных паслуг згодна з Законам па кантролі над экспартам зброі, як дзеянне ў межах Закона аб свабодзе веравызнання ў краінах свету (ЗСВ). Урад ЗША мае шырокі спіс фінансавых і гандлёвых санкцый у адносінах да Бірмы за яе парушэнні правоў чалавека. Урад ЗША адстойвае свабоду веравызнання на ўсіх узроўнях грамадства, уключаючы дзяржаўных чыноўнікаў, рэлігійных лідэраў, асобных грамадзян, вучоных, замежных дыпламатаў, а таксама прадстаўнікоў міжнароднага бізнесу і сродкаў масавай інфармацыі. Падчас усталявання кантактаў і паездак, калі не было перашкод з боку прадстаўнікоў рэжыму, супрацоўнікі амбасады прапаноўвалі падтрымку ды абменьваліся інфармацыяй са шматлікімі, ізаляванымі па тых ці іншых прычынах мясцовымі недзяржаўнымі арганізацыямі і рэлігійнымі лідэрамі.

Кітай.

Пачынаючы з 1999 года, дзяржаўны сакратар прызнае Кітайскую Народную Рэспубліку краінай, што выклікае асаблівую заклапочанасць. У 2005 годзе паранейшаму сакратар прызначыла санкцыі, што ўключалі абмежаванне экспарту інструментаў і абсталявання для кантролю за злачынствамі і іх раскрыцця згодна з Актам аб міжнародных адносінах, як дзеянне ў межах ЗСВ. Дзярждэпартамент ЗША, амерыканская амбасада ў Пекіне і генеральнае консульства ў правінцыях Чэньджоў, Гуанджоў, Шанхай і Шэньян прадпрымалі супольныя намаганні па садзейнічанню ўсталявання большай свабоды веравызнання ў Кітаі, асуджаючы злоўжыванні і падтрымліваючы прагрэсіўныя тэндэнцыі. Публічна і прыватна афіцыйныя прадстаўнікі ЗША шмат разоў заклікалі ўлады КНР паважаць канстытуцыйныя ды сусветна прызнаныя правы грамадзян, свабоду веравызнання і вызваліць усіх вязняў, што адбываюць пакаранне за сваю рэлігійную дзейнасць. Прэзідэнт Буш рэгулярна ўздымаў пытанні свабоды веравызнання падчас сваіх сустрэч з лідэрамі дзяржавы, у тым ліку падчас сустрэчы ў красавіку 2006 года і ў верасні 2005 года з прэзідэнтам Ху Дзіньтао. Намеснік сакратара па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы Бары Лавенкрон падчас свайго візіту ў Пекін праводзіў размовы на тэму свабоды веравызнання. У сваіх публічных выступленнях і ў прыватных гутарках з кітайскімі афіцыйнымі асобамі амбасадар ЗША ў Кітаі асвятляў праблемы са свабодай веравызнання і выпадкі зняволення рэлігійных вязняў сумлення.

Эрытрэя

Дзяржаўны сакратар прызнала ў 2004 годзе Эрытрэю краінай, што выклікае асаблівую заклапочанасць. Як дзеянне ў межах ЗСВ, у 2005 годзе дзяржсакратар загадала адмовіцца ад камерцыйнага экспарту ў Эрытрэю любых абаронных

тавараў і паслуг, што кантралююцца Законам па кантролі над экспартам зброі, за выключэннем некаторых прадметаў, якія выкарыстоўваюцца з мэтай падтрымання міру і барацьбы супраць тэрарызму. Супрацоўнікі амбасады ЗША рэгулярна сустракаліся з лідэрамі рэлігійнай абшчыны. Амбасадар ЗША і іншыя прадстаўнікі амбасады ўздымалі праблемы затрыманняў і абмежавання дзейнасці незарэгістраваных рэлігійных груп у гутарках з дзяржаўнымі чыноўнікамі з Адміністрацыі Прэзідэнта, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства юстыцыі і з лідэрамі адзінай узаконенай палітычнай партыі - Народнага фронту за дэмакратыю і справядлівасць.

Іран

Кожны год, пачынаючы з 1999, дзяржаўны сакратар класіфікаваў Іран як краіну, што выклікае асаблівую заклапочанасць. У 2005 годзе сакратар працягвала вызначаць санкцыі, што ўключаюць абмежаванне дапамогі ЗША ў пытаннях бяспекі згодна з Законам па кантролі над экспартам зброі, як дзеянне ў межах ЗСВ. Злучаныя Штаты не маюць дыпламатычных адносін з Іранам і таму не могуць непасрэдна ўздымаць пытанні пра абмежаванне свабоды веравызнання, якія накладае іранскі ўрад, а таксама пра іншыя парушэнні, якія дзяржава здзейсніла ў адносінах да прыхільнікаў мінарытарных рэлігійных груп. Урад ЗША выказваў свой сур'ёзны пратэст супраць грубага і несправядлівага абыходжання ўладаў Ірана з рэлігійнымі меншасцямі праз публічныя заявы, падтрымку захадаў адпаведных камісій ААН і недзяржаўных арганізацый і праз дыпламатычныя ініцыятывы па пытаннях дзяржаўнага клопату пра свабоду веравызнання ў Іране. Злучаныя Штаты заклікаюць іншыя краіны, што маюць двухбаковыя адносіны з Іранам, выкарыстаць гэтыя сувязі для аказання ціску на Іран у пытаннях свабоды веравызнання і правоў чалавека. Для прыкладу, у 2005 годзе падчас восеньскай сесіі Трэцяга камітэта Генеральнай Асамблеі ААН, Злучаныя Штаты выступілі суаўтарамі паспяховай рэзалюцыі супраць Ірана, у якой сярод іншых парушэнняў правоў чалавека і асноўных свабод былі дакладна вызначаны праблемы са свабодай веравызнання. У рэзалюцыі ААН Злучаныя Штаты публічна асудзілі адносіны да бахаістаў. У шматлікіх выпадках Дзяржаўны дэпартамент ЗША публічна заяўляў пра сітуацыю, што склалася ў краіне  ў дачыненні да бахаісцкіх і іудзейскіх суполак, і ўрад ЗША заклікаў іншыя краіны зрабіць падобныя заявы.

Паўночная Карэя

Кожны год, пачынаючы з 2001, дзяржаўны сакратар вызначае Карэйскую Народную Дэмакратычную Рэспубліку (КНДР) як краіну, што выклікае асаблівую заклапочанасць. У 2005 годзе дзяржсакратар працягвала вызначаць санкцыі, якія ўключаюць абмежаванне нармальных гандлёвых сувязяў і іншых гандлёвых прэферэнцый, прадугледжаных Законам аб гандлі 1974 года і Папраўкай Джэксана-Ваніка, як дзеянне ў межах ЗСВ. Урад ЗША не падтрымлівае дыпламатычных адносін з КНДР і разам з іншымі краінамі і ў  шматбаковай дыскусіі выказвае сваю занепакоенасць ганебным станам правоў чалавека ў гэтай краіне. Так Злучаныя Штаты восенню 2005 года на Генеральнай Асамблеі ААН сумесна з іншымі

краінамі падрыхтавалі паспяховую рэзалюцыю па пытаннях абмежавання свабоды веравызнання. Намеснік дзяржаўнага сакратара па ўсходнеазіяцкіх і ціхаакіянскіх справах Крыстафер Хіл публічна зазначыў, што дыялог па пытаннях выканання правоў чалавека ў КНДР стане часткай любога будучага працэса нармалізацыі адносін паміж КНДР і ЗША. У красавіку 2005 года шэраг афіцыйных прадстаўнікоў Дзярждэпаратамента засведчылі ў Камітэце па замежных справах палаты прадстаўнікоў сітуацыю з правамі чалавека ў КНДР і намаганні ўрада ЗША па ажыццяўленні Закона аб правах чалавека ў Паўночнай Карэі (2004 год). Яны разам з амбасадарам ЗША, упаўнаважаным па пытаннях свабоды веравызнання ў краінах свету, неаднаразова звярталі ўвагу на дрэнную сітуацыю ў сферы правоў чалавека ў КНДР цягам сваіх выступленняў перад амерыканскай аўдыторыяй. У жніўні 2005 года прэзідэнт прызначыў Джэя Леўкавіча спецыяльным дыпламатычным  прадстаўніком па правах чалавека ў Паўночнай Карэі ў адпаведнасці з адным з палажэнняў Закона аб правах чалавека ў Паўночнай Карэі. З моманту прызначэння Джэй Леўкавіч настойліва пераконваў іншыя краіны, у тым ліку Карэйскую Рэспубліку і Японію, далучыцца да растучай міжнароднай кампаніі па перакананні КНДР выступіць па стане правоў чалавека і парушэннях свабоды веравызнання ў краіне. Таксама ў 2005 годзе Дяржэпартамент ЗША вылучыў грант у суме 496 тысяч даляраў Нацыянальнаму фонду дэмакратыі для паляпшэння і пашырэння інфармацыі па сітуацыі з правамі чалавека ў КНДР, а таксама вылучыў грант арганізацыі “Фрыдам Хаус” на правядзенне шэрагу канферэнцый і на іншую дзейнасць па папярэджанні рэжыму спыніць парушэнні. Радыёстанцыі “Свабодная Азія” і “Голас Амерыкі” таксама ажыццяўлялі рэгулярнае вяшчанне на карэйскай мове. Палітыка амерыканскага ўрада не забараняе грамадзянам Злучаных Штатаў наведваць краіну, і шэраг цэркваў ды рэлігійных груп арганізуюць свае намаганні для таго, каб палегчыць пакуты людзей, выкліканыя недахопам ежы ды лекаў.

Саудаўская Аравія

Дзяржаўны сакратар класіфікавала Саудаўскую Аравію як краіну, якая выклікае асаблівую заклапочанасць, упершыню. Высокапастаўленыя чыноўнікі Дзярждэпартамента Злучаных Штатаў і прадстаўнікі амбасады ЗША сустракаліся з высокапастаўленымі прадстаўнікамі ўрада Саудаўскай Аравіі і з рэлігійнымі лідэрамі для абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання, амбасадар ЗША таксама абмяркоўваў пэўныя парушэнні з дзяржаўнымі чыноўнікамі. Супрацоўнікі ўрада ЗША сустракаліся таксама з прадстаўнікамі ўрада Саудаўскай Аравіі з мэтай выказаць сваю заклапочанасць распаўсюджаннем літаратуры, якая прапагандуе нецярпімасць, а таксама ідэалогіі экстрэмізму, і абмеркаваць неабходнасць ураду Саудаўскай Аравіі паслядоўна выконваць сваё публічнае абавязацельства даць дазвол немусульманскаму насельніцтву на прыватнае рэлігійнае набажэнства, ліквідаваць дыскрымінацыю меншасцяў, садзейнічаць пашырэнню памяркоўнасці ў адносінах да немусульман і паважаць правы мусульман, якія не следуюць кансерватыўным традыцыям суніцкага ісламу Ханбалі. Гэтыя дыскусіі зрабілі магчымым вызначыць і сцвердзіць шэраг ключавых пазіцый па тым, што ўрад праследуе і будзе праследаваць задачы садзейнічання пашырэнню свабоды

рэлігійных практык і павышэнню талерантнасці ў адносінах да рэлігійных груп. Гэта ўключае стратэгію, накіраваную на прыпыненне распаўсюджання літаратуры, што сее нецярпімасць, і ідэалогіі экстрэмізму як у Саудаўскай Аравіі, так і ва ўсім свеце, на абарону права не прыватнае набажэнства і на стрымліванне нападкаў на рэлігійную дзейнасць. Напрыклад, урад Саудаўскай Аравіі праводзіць усебаковую рэвізію падручнікаў і вучэбных планаў, каб адсеяць зневажальныя выпады ў адносінах да рэлігійных груп, і гэты працэс зойме ад аднаго да двух гадоў. Саудаўскія ўлады таксама наладзілі перападрыхтоўку настаўнікаў і рэлігійнай паліцыі для таго, каб абараніць правы мусульман і немусульман, а таксама садзейнічаць пашырэнню памяркоўных адносін і процістаяць экстрэмізму. Урад Саудаўскай Аравіі таксама стварыў Камісію па правах чалавека, куды можна звярнуцца з разнастайнымі скаргамі на парушэнні правоў чалавека. У святле гэтых пазітыўных зрухаў дзяржсакратар прыпыніла санкцыі для “дасягнення мэтаў закона”.

Судан

Кожны год, пачынаючы з 1999, дзяржаўны сакратар класіфікаваў Судан як краіну, якая выклікае асаблівую заклапочанасць. Са шматлікіх санкцый ЗША супраць Судана ў 2005 годзе сакратаром было працягнута дзеянне адной санкцыі, якая заключаецца ў выкарыстанні права голасу і вета Злучаных Штатаў у пытанні ўстрымання ці адмовы Судану ў крэдытах або іншых спосабах выкарыстання фондаў міжнародных фінансавых устаноў у адпаведнасці з Актам аб міжнародных фінансавых установах, як дзеянне згодна з ЗСВ. Амерыканскі ўрад дапамагаў Ураду нацыянальнага адзінства выконваць абяцанні забеспячэння свабоды веравызнання, зробленыя ў межах Усеагульнага мірнага пагаднення і Часовай нацыянальнай Канстытуцыі, і раз’ясняў, што абмежаванне свабоды веравызнання перашкаджае паляпшэнню адносін паміж Злучанымі Штатамі і  Суданам. Намеснік дзяржаўнага сакратара Роберт Зэлік арганізаваў міжканфесійны форум пры ўдзеле хрысціянскіх і мусульманскіх лідэраў у Хартуме падчас свайго візіту ў лістападзе 2005 года. Супрацоўнікі амбасады часта сустракаліся з лідэрамі розных рэлігійных груп. Амбасада ЗША развівала працоўныя адносіны з шэрагам мусульманскіх і хрысціянскіх лідэраў, дыпламаты сустракаліся на пастаяннай аснове з такімі лідэрамі ў Хартуме, Джубе, а таксама падчас сваіх паездак па рэгіёнах.

Вьетнам

Цягам справаздачнага перыяду адбыліся сур’ёзныя пазітыўныя змены ў становішчы свабоды веравызнання ў Вьетнаме (гл. частку 2). Упершыню класіфікаваная як краіна, што выклікае асаблівую заклапочанасць, у 2004 годзе, Вьетнам цесна супрацоўнічаў з ЗША ў наступныя месяцы, плёнам чаго стаў абмен у траўні 2005 года лістамі, у якіх ахопліваліся наступныя пытанні: поўнае выкананне новых законаў аб рэлігійнай дзейнасці, распараджэнне месным уладам строга і поўнасцю прытрымліваццa новага заканадаўства і забяспечваць яго выкананне, забяспечваць працэс, дзякуючы якому рэлігійныя канфесіі мелі магчымасць адчыніць памяшканні для набажэнства, а таксама спецыяльнае

абмеркаванне выпадкаў зняволенняў і судовых спраў, што выклікаюць заклапочанасць, узнятыя Злучанымі Штатамі падчас амністыі зняволеных. Гэты абмен лістамі змякчае іншыя меры, прадугледжаныя ў рамках ЗСВ. Амбасада ЗША ў Ханоі і генеральнае консульства ЗША ў горадзе Хо Шы Мін падтрымлівалі актыўны і рэгулярны дыялог з высокапастаўленымі дзяржаўнымі чыноўнікамі і чыноўнікамі рабочага ўзроўню з мэтай адстойваць большую свабоду веравызнання. Афіцыйныя прадстаўнікі Злучаных Штатаў таксама рэгулярна сустракаюцца і гутараць з рэлігійнымі лідэрамі будысцкіх, каталіцкіх, пратэстанцкіх Чао Даі Хоа Хао ды мусульманскіх суполак, у тым ліку з рэлігійнымі актывістамі, што знаходзяцца пад пільным наглядам з боку ўладаў. Падчас сваіх паездак за межы Ханоя і Хо Шы Міна супрацоўнікі амбасады і генеральнага консульства рэгулярна сустракаліся з мясцовымі Камітэтамі па справах рэлігій, вясковым кіраўніцтвам, мясцовым духавенствам і вернікамі. Амбасадар ЗША і іншыя дыпламаты, у тым ліку амбасадар, упаўнаважаны па пытаннях свабоды веравызнання ў краінах свету, выказвалі прэм'ер-міністру, намеснікам прэм'ер-міністра, Кабінету Міністраў, лідэрам камуністычнай партыі Вьетнама, мясцовым уладам і іншым сваю заклапочанасць абмежаваннямі і праблемай прызнання, з якімі сутыкаюцца рэлігійныя арганізацыі, а таксама затрыманнямі і арыштамі рэлігійных дзеячаў, складанасцямі, з якімі пратэстанты сутыкаюцца на тэрыторыі Цэнтральнага Узвышша і на поўначы Вьетнама, уключна з Паўночна-Заходнім Узвышшам, ды іншымі абмежаваннямі свабоды веравызнання. Амбасадар, упаўнаважаны па пытаннях свабоды веравызнання ў краінах свету, і яго супрацоўнікі наведвалі розныя рэгіёны краіны 6 разоў у перыяд з 2003 па 2006 гады, дзе сустракаліся з рэлігійнымі лідэрамі і дзяржаўнымі чыноўнікамі. Урад ЗША рэгулярна садзейнічаў вызваленню вязняў, якія, па меркаваннях, былі затрыманы пераважна па рэлігійных прычынах. На працягу перыяду, ахопленага дадзенай спарваздачай, урад выпусціў з турмы 4-ох  чалавек, якія, паводле інфармацыі розных крыніц, былі пазбаўлены волі ў сувязі з іх рэлігійнай дзейнасцю.

## Частка 2. Стан свабоды веравызнання ў канкрэтных краінах

У гэтай  частцы сціслa апісваецца сітуацыя са свабодай веравызнання ў шэрагу краін, дзе гэтае пытанне ўяўляе сабой значны інтарэс. Для кожнай краіны даецца характарыстыка прававой сітуацыі і адпаведнай палітыкі і прыводзяцца прыклады канкрэтных парушэнняў уладамі свабоды веравызнання або прадпрынятых імі пазітыўных крокаў у падтрымку свабоды веравызнання цягам справаздачнага перыяду.

### Афганістан

Згодна з Канстытуцыяй Афганістана, прыхільнікі іншых рэлігій могуць свабодна практыкаваць сваю веру і праводзіць свае рэлігійныя абрады ў межах, забяспечаных палажэннямі закона. Тым не менш, сцвярджаецца таксама, што іслам – "дзяржаўная рэлігія" і што "ніякі закон не можа супярэчыць перакананням і палажэнням святой рэлігіі ісламу". Хоць урад у цэлым і паважаў права на свабоду веравызнання, дзесяцігоддзі вайны, гады кіравання Талібану і слабыя

дэмакратычныя структуры, у тым ліку нерэфармаваная судовая сістэма, спрыялі захаванню кансерватыўнай культуры нецярпімасці, якая часам праяўлялася ў актах парушэнняў і насілля супраць мусульман – прыхільнікаў рэформ і рэлігійных меншасцяў. Усеагульнае асуджэнне, што ўзнікла ў часы пераўтварэнняў, а таксама выпадкі цэнзуры, павысілі заклапочанасць пра магчымасць свабодна практыкаваць такія рэлігіі ў Афганістане. З-за ціску з боку грамадства некаторыя прадстаўнікі рэлігійных меншасцяў скрывалі сваю рэлігійную прыналежнасць, а афганскія сікхі і індуісцкае насельніцтва сутыкаліся з цэлым шэрагам праблем. Дачыненні паміж рознымі сектамі ісламу ў краіне па-ранейшаму заставаліся складанымі. Гістарычная шыіцкая меншасць зведала дыскрымінацыю з боку мажарытарнага суніцкага насельніцтва. Нягледзячы на гэтыя праблемы, цягам справаздачнага перыяду ўрад прадпрыняў некалькі прагрэсіўных крокаў па пашырэнні сабоды веравызнання. Мінстэрствы па справах жанчын і па справах рэлігій працавалі супольна над пытаннем прадстаўлення жанчынам больш шырокага доступу ў мячэці. Урад таксама станоўча рэагаваў на міжнародныя падыходы да пытання свабоды веравызнання і плённа працаваў над актыўна падтрыманымі судовымі справамі, такімі як абвінавачанне ў багахульстве журналіста Махакека Насаба і абвінавачанне ў адступніцтве хрысціянскага пярэхрыста Абдулы Рахмана.

Бруней

Нягледзячы на замацаваныя ў Канстытуцыі палажэнні пра поўную і неабмежаваную свабоду веравызнання, урад Брунея выкарыстоўваў некаторыя законы з мэтай абмежаваць распаўсюджанне іншых, чым іслам, рэлігій. Разнастайныя рэлігійныя групы Брунея мірна суіснуюць, аднак экуменічнаму ўзаемадзеянню перашакаджаў дамінуючы ісламскі рэлігійны дух, які адахвочваў мусульман ад знаёмства з іншымі веравызнаннямі і забараняў прадстаўнікам іншых рэлігій звяртаць у сваю веру. У той самы час лідэры ісламу арганізавалі шэраг акцый з мэтай тлумачэння ісламу і яго прапаганды, таксама яны прапанавалі фінансавую падтрымку, жытло і новыя мячэці для новазвернутых у іслам.

Бірма

Бірманскі рэпрэсіўны аўтарытарны ваенны рэжым накладае абмежаванні на рознага роду рэлігійную дзейнасць і часта зневажае права на свабоду веравызнання. Бальшыні прыхільнікаў зарэгістраваных рэлігій дазволена маліцца, як яны жадаюць, аднак урад працягваў умешвацца і адсочваць дзейнасць практычна ўсіх арганізацый, у тым ліку і рэлігійных. Улады таксама сістэматычна стрымлівалі намаганні будысцкага духавенства садзейнічаць пашырэнню правоў чалавека і палітычных свабод. Урад актыўна прасоўваў тэравадыйскі будызм, асабліва сярод этнічных меншасцяў, а лаяльнасць да будызму заставалася ў бальшыні выпадкаў перадумовай атрымання чыноўнікамі і ваеннымі больш высокага рангу. Працягвалася як насілле супраць мусульман, так і пільны кантроль за іх дзейнасцю. Па ўсёй краіне таксама па-ранейшаму захоўваліся абмежаванні на правядзенне малітоўных служб іншымі, небудысцкімі меншасцямі.

Кітай

Кітайская Канстытуцыя забяспечвае свабоду веравызнання, тым не менш, павага ўладаў да свабоды рэлігіі і свабоды сумлення застаецца на нізкім узроўні. Існавалі нешматлікія сведчанні таму, што новыя законы па рэгуляцыі рэлігійных спраў, якія ўступілі ў сілу ў 2005 годзе, прывялі да паляпшэння сітуацыі са свабодай веравызнання. У іх працягвалі вызначацца як нармальныя і законныя толькі ўхваленыя ўрадам рэлігійныя практыкі і веравызнанні. У бальшыні раёнаў краіны вернікі маглі здзяйсняць набажэнства ў афіцыйна дазволеных месцах без нейкіх асаблівых складанасцяў. Тым не менш, у некаторых раёнах мелі месца сур'ёзныя абмежаванні. Афіцыйныя асобы аўтаномнай вобласці уйгур Хіньян пільна кантралявалі рэлігійную дзейнасць. У адным выпадку ў жніўні 2005 года уігурскі настаўнік Амінан Маміхі разам з трыццаццю студэнтамі быў затрыманы пасля таго, як правёў вучэбную сесію Карана ў сваім доме падчас летніх вакацый. У якасці яўнай помсты за актывізм у сферы міжнародных правоў чалавека і свабоды веравызнання, уігурская мусульманка Рэбія Кадээр была затрымана кітайскімі ўладамі, а таксама, па звестках, трое яе сыноў сталі аб'ектамі праследавання і былі абвінавачаны ў фінансавых злачынствах, звязаных з яе сумеснымі прадпрыемствамі ў Хіньяне. Паслядоўнікі тыбецкага будызму, у тым ліку ў мангольскай аўтаномнай воласці Інэр і Тыбецкай частцы Кітая, сутыкнуліся з абмежаваннямі сваіх рэлігійных практык і магчымасці ствараць арганізацыі. Па-ранейшаму шырока паведамлялася пра рэпрэсіі ў адносінах да незарэгістраваный сеткі пратэстанцкіх цэркваў і “хатніх” цэркваў.

Лідэры хатняй царквы часам затрымліваліся, арыштоўваліся і прыгаворваліся да перавыхавання ці пазбаўлення волі. Дзяржаўныя органы працягвалі пільна адсочваць кантакты паміж грамадзянамі і іншаземцамі, якія займаліся рэлігійнай дзейнасцю, затрымлівалі некаторых грамадзян за прадстаўленне рэлігійнай інфармацыі іншаземцам і прадухілялі паездкі за мяжу прадстаўнікоў некаторых рэлігій, як гэта здарылася з царкоўным гісторыкам Джангам Юнанам, якога ўлады змясцілі пад хатні арышт і якому адмовілі ў выдачы пашпарта. У чэрвені 2006 года хрысціянскі пастар правінцыі Хенан Джанг Рандліянг быў прыгавораны да сямі з паловай гадоў турмы за тое, што здабыў махлярскім шляхам пашпарт і нелегальна перасек мяжу. “Падпольныя” каталіцкія біскупы таксама зведалі рэпрэсіі ў асноўным праз сваю лаяльнасць да Ватыкана, які ўрад абвінаваціў ва ўмяшальніцтве ва ўнутраныя справы Кітая. Урад прадэманстраваў некаторае жаданне палепшыць адносіны з Ватыканам пасля візіту Папы Бенедыкта XVI, аднак Пекін і Ватыкан моцна разышліся ў красавіку 2006 года ў пытаннях кантролю над пасвячэннем біскупаў у духоўны сан. Урад працягваў чыніць рэпрэсіі ў дачыненні да груп, якія адносіў да “культаў” у цэлым, і да малых хрысціянскіх груп, у прыватнасці да Фалун Гонг. У чэрвені 2006 года пастар Ху Шуангфу і пяцёра былых членаў царквы “Трох ступеняў служак”, якая ў Кітаі ўспрымаецца як культ, былі асуджаны на смерць па справе аб забойстве на глебе канфлікту паміж гэтай царквой і Усходняй бліскавічнай групай, якая таксама разглядаецца дзяржавай як культ. Мноства членаў царквы “Трох супеняў служак” апынуліся ў судзе цягам справаздачнага перыяду. Прыхільнікаў Фалун Гонг па-ранейшаму

арыштоўвалі, затрымлівалі і пазбаўлялі волі, таксама існуюць вартыя даверу звесткі пра смерць ад катаванняў і здзекаў. Вернікі, што адмовіліся публічна вырачыся сваёй веры, часам падлягалі ў турме жорсткаму абыходжанню і перавыхаванню ў працоўных калоніях ды пазасудовых “праравых адукацыйных” цэнтрах.

Куба

Канстытуцыя Кубы прызнае права грамадзян на вызнаванне і практыку любой рэлігіі, якая паважае закон, аднак і па законе, і на практыцы ўлады працягвалі накладаць абмежаванні на свабоду веравызнання. Некаторыя рэлігійныя дзеячы, што ў сваіх казанях крытыкавалі кубінскую дзяржаўную таталітарную сістэму, падвягаліся сур’ёзным праследаванням. У цэлым незарэгістраваныя рэлігійныя групы працягвалі адчуваць на сабе розную ступень дзяжаўнага ўмяшальніцтва, нападкаў ды рэпрэсій. Урад праводзіў сваю палітыку дазволу непалітычнай рэлігійнай дзейнасці ў афіцыйна зацверджаных месцах. Тым не менш, набажэнства грамадзян у афіцыйна дазволеных цэрквах знаходзілася пад кантролем дзяржаўных сіл бяспекі і дзяржава па-ранейшаму рабіла захады максімальна адсочваць рэлігійную дзейнасць. Кубінскі ўрад праводзіў у жыццё новыя палажэнні, што абмяжоўвалі дзейнасць хатніх цэркваў, аднак спрашчаў сваю палітыку па выдачы дазволаў на працу замежнага каталіцкага духавенства.

Егіпет

Канстытуцыя Егіпта гарантуе свабоду веры і практыкі рэлігійных рытуалаў, калі яны знаходзяцца ў рамках павагі да закона, хоць на практыцы ўрад і абмяжоўвае гэтае права. Рэлігійныя практыкі, што супярэчаць дзяржаўнай інтэрпрэтацыі шырыяту ці ісламскаму закону, знаходзяцца пад забаронай. Члены немусульманскіх рэлігійных меншасцяў афіцыйна прызнаюцца егіпецкімі ўладамі і могуць праводзіць набажэнствы без нападкаў з іх боку, у той час як традыцыя і некаторыя аспекты закона з’яўляюцца дыскрымінацыйнымі ў адносінах да рэлігійных меншасцяў, такіх як хрысціяне і асабліва бахаісты, што не прызнаюцца законам. Урад па-ранейшаму адмаўляўся прызнаваць грамадзянскія дакументы, у тым ліку пасведчанні асобы, пасведчанні аб нараджэнні і аб заключэнні шлюбу, членаў суполкі бахаістаў, якая ўключае ад 500 да 2000 членаў. Ён падаў апеляцыю на рашэнне, прынятае 4 красавіка адміністратыўным судом, які падтрымаў права бахаістаў атрымліваць пасведчанні асобы і пасведчанні аб нараджэнні з указаннем у гэтых дакументах рэлігійнай прыналежнасці.  Многія цэрквы працягвалі адчуваць складанасці з атрыманнем дазволу на рамонт і перабудову сваіх памяшканняў насуперак прэзідэнцкаму ўказу, падпісанаму ў снежні 2005 года, які сцвярджаў, што такі дазвол, які раней патрабаваў ягонага зацвярджэння, можа быць выдадзены мясцовымі ўладамі. У мінулым урад не забяспечваў тым, хто перайшоў з ісламу ў хрысціянства, законныя механізмы змены грамадзянскіх дакументаў для адлюстравання іх новага рэлігійнага статуса. За апошнія 2 гады ў адносінах да прыкладна 32 мусульман, якія перайшлі ў іслам з хрысціянства, было прынята рашэнне, якое дазволіла ім вярнуць сваю першапачатковую хрысціянскую

прыналежнасць. Метвалі Ібрагім Метвалі Салех, арыштаваны Дзяржаўнай службай бяспекі ў траўні 2003 года, відавочна, за свае погляды на іслам, у тым ліку за прыхільнасць да права пераходу ў іншую рэлігію, быў адпушчаны 23 красавіка, пасля таго як атрымаў у сваю падтрымку 8 асобных судовых пастаноў Вышэйшага дзяржаўнага суда па пытаннях надзвычайнай бяспекі і афіцыйнае заключэнне пракурора дзяржаўнай бяспекі з загадам аб яго вызваленні.

Эрытрэя

Сітуацыя са свабодай веравызнання абсалютна не змянілася ў лепшы бок, а ў некаторых раёнах нават пагоршылася. Урад Эрытрэі жорстка абмяжоўваў свабоду веравызнання ў дачыненні да тых груп, якія не былі зарэгістраваныя, а таксама парушаў права некаторых зарэгістраваных груп на незалежнасць. Услед за ўказам 2002 года, паводле якога рэлігійныя групы павінны былі прайсці рэгістрацыю, улады зачынілі ўсе рэлігійныя пабудовы, што не належалі чатыром асноўным рэлігійным арганізацыям краіны: Эрытрэйскай праваслаўнай царкве, рымска-каталіцкай царкве, евангелісцкай (лютэранцкай) царкве Эрытрэі і ісламу. Улады працягвалі праследаваць, арыштоўваць і затрымліваць членаў незалежных евангелісцiх суполак (у тым ліку пяцідзесятнікаў), Сведкаў Іеговы і рэфармісцкага руху ў рамках Эрытрэйскай праваслаўнай царквы. Урад таксама ўмяшаўся ў працэдурныя ды адміністратыўныя рашэнні Эрытрэйскай праваслаўнай царквы, змясціўшы патрыярха і прызначыўшы свайго кандыдата. Урад не зарэгістраваў усе чатыры рэлігійныя суполкі, якія ў 2002 годзе звярнуліся па рэгістрацыю, а таксама абмяжоўваў рэлігійныя сходы і арыштоўваў асобных прадстаўнікоў падчас рэлігійных цырымоній, сустрэч і маленняў. Паступалі таксама звесткі пра прымусовыя публічныя адрачэнні. Некаторыя зняволеныя па рэлігійных матывах утрымліваліся ў суровых умовах у памяшканнях з моцнымі перападамі тэмпературы, без дазволу на сустрэчы з сем’ямі або з вельмі абмежаванай магчымасцю мець такія сустрэчы.

Індыя

Канстытуцыя Індыі забяспечвае свабоду веравызнання, а ўрад у цэлым паважае гэтае права на практыцы. Хоць нацыянальныя ўлады прадпрымаюць у ключавых абласцях крокі наперад з мэтай паляпшэння сітуацыі са свабодай веравызнання, стан свабоды рэлігіі ў асноўным застаецца на тым самым узроўні цягам усяго спарваздачнага перыяду.

Урад Аб’яднанага прагрэсіўнага альянса працягваў фармаваць платформу, заснаваную на павазе да свецкага ўрада і на рэлігійнай талерантнасці. Вялізная колькасць індусаў, што вызнаюць розныя рэлігіі, мірна суіснуюць разам. Тым не менш, некаторыя экстрэмісты па-ранейшаму беспаспяхова абвінавачваліся ў нападках на рэлігійныя меншасці, пераважна на дзяржаўным і месным узроўнях, што служыла сігналам таго, што яны могуць здзяйсняць такое парушэнне беспакарана. Рэлігійныя перамовы заставаліся надзвычай спрэчным пытаннем і тэрарысты працягвалі прымяняць звышжорсткую сілу супраць рэлігійных мішэняў.

Нацыянальны ўрад рэагаваў досыць хутка і браў пад кантроль дзейнасць індуісціх экстрэмістаў, папярэджваў рэваншысцкія атакі ды расправы і пераконваў мусульманскую суполку ў яе бяспецы. Улады правінцыі Раджастан у сакавіку 2006 года правялі Закон супраць пераходу ў іншыя рэлігіі, але да канца справаздачнага перыяду ён так і не быў падпісаны губернатарам і чакаў разгляду прэзідэнта. У жніўні 2005 года камісія Нанаваці, якая мела задачу правесці паўторнае расследаванне антысікскага паўстання 1984 года, выпусціла сваю справаздачу, у якой спасылалася на саўдзел шэрагу буйных лідэраў Партыі кангрэса ў насіллі, уцягванні праваахоўных органаў у забойствы ды заснаванне камітэтаў для размеркавання дапамогі сярод сем'яў ахвяр. У адказ на мандат Вышэйшага суда ў лютым 2006 года праваахоўныя органы правінцыі Гуджарат паведамілі, што будуць праводзіць паўторнае расследаванне 1600 з прыкладна 2000 судовых спраў, што былі перададзены ў архіў і закрыты ў 2002 годзе.

Іран

Цягам справаздачнага перыяду адбывалася далейшае пагаршэнне і без таго надзвычай дрэннай сітуацыі са свабодай веравызнання. Дзеянні і рыторыка ўладаў стваралі пагрозлівую атмасферу практычна для ўсіх, хто практыкуе джафарскі (Твэлвер) шыіцкі іслам. Падкантрольныя ўраду сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку тэлебачанне, радыё і прэса, распачалі кампанію траўлі рэлігійных меншасцяў, асабліва бахаістаў, што паследавала за выбарамі ў 2005 годзе прэзідэнта Махмуда Ахмадзінэджада. Паступала інфармацыя пра зняволенні, праследаванні, запалохванні і дыскрымінацыю на рэлігійнай глебе. Адзінымі юрыдычна прызнанымі рэлігійнымі меншасцямі з'яўляюцца прыхільнікі зораастызму, індуісты ды хрысціяне, тым не менш, нават члены гэтых груп паведамлялі пра пазбаўленні волі, праследаванні, запалохванні і дыскрымінацыю па рэлігійных матывах у дачыненні да іх. 22 лістапада 2005 года невядомыя забілі чалавека, які перайшоў у хрысціянскую веру 10 гадоў таму. Паводле атрыманай інфармацыі, пасля яго забойства паследавалі рэпрэсіі і пагрозы ў бок іншых хрысціян, у тым ліку 10 хрысціян было арыштавана. Іранскі ўрад расцэньвае вернікаў-бахаістаў як палітычна арыентаваную ерэтычную ісламскую групу, антаганістычную ісламскай рэвалюцыі ў краіне, і працягвае забараняць бахаістам распаўсюджваць і практыкаваць сваю веру (бахаісты лічаць сябе не мусульманамі, а прыхільнікамі незалежнай рэлігіі, якая паходзіць з шыіцкай ісламскай традыцыі). У перыяд, ахоплены дадзенай справаздачай, дзяржава больш яўна абмяжоўвала дзейнасць суфісцкіх мусульманскіх груп і месцы іх набажэнства, а самі суфісты паведамлялі пра няспынныя праследаванні і запалохванні сваіх знаных лідэраў з боку разведкі і службаў бяспекі. Хоць законы, што рэгулююць практыку суфізму, неадназначныя, паступалі паведамленні пра тое, што ўлады заклікалі да поўнай забароны суфізму.

Ізраіль і Акупаваныя Тэрыторыі

Канстытуцыя Ізраіля гарантуе свабоду набажэнства, і ўрад у цэлым паважае гэтае права. У адказ на тэрарыстычныя дзеянні на Акупаваных Тэрыторыях жорсткая ізраільская палітыка закрытасці часта прыводзіла ў выніку да абмежавання

магчымасці палестынцаў наведваць месцы набажэнства і практыкаваць свае рэлігіі. Самавольства, што працягвалася пачынаючы з часоў другой Інтыфады, або паўстання, у 2000 годзе ў сур'ёзнай ступені звузіла рэлігійную практыку ў многіх раёнах Акупаваных Тэрыторый і прывяло да пашкоджанняў месцаў набажэнства ды рэлігійных святыняў. Увядзенне ўладамі Ізраіля раздзяляльнай сцяны таксама абмежавала доступ да святых месцаў і стварыла значную пагрозу працы тых рэлігійных арганізацый, што забяспечвалі гуманітарную дапамогу і сацыяльныя паслугі палестынскаму насельніцтву. Такога роду перашкоды чыніліся не толькі ў адносінах да вернікаў і рэлігійных арганізацый, часам улады спрабавалі зменшыць іх уплыў на рэлігійныя суполкі. Улады Ізраіля канфіскоўвалі зямлю (звычайна прапаноўваючы абмежаваную кампенсацыю, якую цэрквы не прымалі), што належала розным рэлігійным установам, каб пабудаваць сцяну. Мухамед Абас, прэзідэнт Палестыны, прадпрыняў крокі, каб выключыць магчымасць рэлігійнага падбухторвання, хоць выпадкі такога падбухторвання ўсё яшчэ мелі месца. Паводле асноўнага закона Палестынскай Аўтаноміі, прынцыпы шырыяту (ісламскага закона) з'яўляюцца "асноўнай крыніцай заканадаўства". Моцная ўзаемасувязь паміж рэлігіяй, этнічнай прыналежнасцю і палітыкай на Акупаваных Тэрыторыях часам надавала ізраільска-палестынскаму канфлікту рэлігійны характар. Рыторыка палестынскіх тэрарыстычных груп уключала і антысеміцкія выказванні. Некаторыя рэлігійныя лідэры мусульман чыталі на дзяржаўным тэлеканале Палестыны казані, якія таксама ўтрымлівалі антысеміцкія выпады. Тым не менш, 28 кастрычніка 2005 года ізраільскія СМІ працытавалі словы Саеба Эрэката, кіраўніка дэлегацыі Арганізацыі вызвалення  Палестыны (АВП) па перамовах, пра тое, што заява прэзідэнта Ірана, у якой гаварылася, што Ізраіль павінен быць сцерты з карты, "непрымальная". У цэнтры растучага хаосу і беззаконня на Заходнім Беразе і ў Сектары Газа, у мінулыя гады паступалі вартыя даверу паведамленні пра тое, што палестынскія сілы бяспекі і прадстаўнікі судовай сістэмы ўваходзілі ў змову з членамі банд з мэтай адняць у хрысціян іх землі. Хоць і не паступала паведамленняў ад хрысціян, што яны былі мішэнню вымагальніцтва ці праследаванняў цягам перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, аднак Палестына не прадпрымала дзеянні па расследаванні былых несправядлівасцяў, якія паводле меркаванняў, былі здзейснены палестынскімі афіцыйнымі асобамі. У самім Ізраілі працягвалі існаваць праблемы,  што вынікалі пераважна з няроўных адносін да рэлігійных меншасцяў і з прызнання дзяржавай толькі артадаксальных яўрэйскіх рэлігійных уладаў персанальна і некаторых пытанняў грамадзянскага статусу яўрэяў. Стасункі паміж рэлігійнымі групамі – паміж іудзеямі і неіудзеямі, мусульманамі і хрысціянамі, свецкімі і рэлігійнымі яўрэямі, а таксама паміж living рознымі плынямі іудаізму – часта былі нацягненымі, таксама існавала інстытуцыйная, юрыдычная і сацыяльная дыскрымінацыя ў адносінах да арабскага насельніцтва краіны.

Лаос

У некаторых раёнах улады працягвалі дэманстраваць неталерантныя адносіны да мінарытарнай рэлігійнай практыкі, асабліва хрысціян-евангелістаў. Хрысціян затрымлівалі і арыштоўвалі або прымушалі іх адступіцца ад сваёй веры пад

пагрозай арышту ці гвалтоўнага высялення з родных вёсак. У пачатку 2006 года старэйшына ў правінцыі Аўдамсаі канфіскаваў зямлю ў некалькіх хрысціянскіх сем'яў. Хрысціяне ў правінцыі Салаван знаходзіліся пад хатнім арыштам з 1 красавіка 2006 года за адмову адрачыся ад сваёй веры. Група пераселеных прадстаўнікоў этнічнай меншасці хмонг, высланая за мяжу тайскімі ўладамі, была затрымана ў правінцыі Балікхамсай у снежні 2005 года, некаторыя крыніцы адзначаюць, што прадстаўнікі хмонг з'яўляюцца хрысціянамі і маглі быць затрыманы ў Лаосе часткова ў сувязі са сваёй рэлігійнай дзейнасцю. Таксама ў канцы 2005 года кіраўніцтва вёскі спаліла Лаоскую евангельскую царкву ў правінцыі Бакео і арыштавала шасцярых лідэраў царквы, пазней пяць з шасці былі адпушчаны, а апошні памер пасля таго, як быў перавезены з пастарунку ў ваенны шпіталь. Канфлікты паміж этнічнымі групамі часам абвастралі рэлігійнае напружанне.

Паўночная Карэя

Хоць Канстытуцыя і забяспечвае "свабоду рэлігійнай веры", аднак сапраўднай свабоды веравызнання не існавала, а таксама ў справаздачны перыяд не адбывалася зменаў у надзвычай нізкім узроўні павагі да свабоды веравызнання. Урад жорстка абмяжоўваў свабоду рэлігіі, у тым ліку арганізаваную рэлігійную дзейнасць, за выключэннем той, што знаходзілася пад пільным кантролем афіцыйна прызнаных груп, звязаных з дзяржавай. Шэраг іншаземцаў, што наведвалі краіну, зазаначалі, што царкоўныя службы выглядалі інсцэніраванымі і мелі палітычны падтэкст у падтрымку рэжыму. Замежныя назіральнікі мелі абмежаваныя магчымасці высветліць узровень дзяржаўнага кантролю над гэтымі групамі, аднак ў цэлым мяркуецца, што яны знаходзіліся пад пільнай увагай. У паведамленнях перабежчыкаў па-ранейшаму сцвярджалася, што яны былі сведкамі арыштаў і пакаранняў смерцю членаў падпольных хрысціянскіх цэркваў, якія здзяйсняў рэжым у папярэднія гады. Не існуе праверанай інфармацыі пра колькасць затрыманых або зняволеных па рэлігійных матывах, аднак ёсць непацверджаныя звесткі, што многіх людзей затрымлівалі за іх вераванні і рэлігійную дзейнасць. Турэмныя ўмовы заставаліся суровымі, а голад і прымусовая праца – агульнараспаўсюджанымі.

Пакістан

Краіна з'яўляецца ісламскай рэспублікай. Іслам выступае ў якасці дзяржаўнай рэлігіі, і Канстытуцыя патрабуе, каб законы адпавядалі ёй. Урад прадпрымаў некаторыя захады для паляпшэння адносін да рэлігійных меншасцяў цягам перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, аднак сур'ёзныя праблемы захоўваліся. Дыскрымінацыйнае заканадаўства і нежаданне ўрада прадпрымаць дзеянні для пераадолення непрыязных адносін у грамадстве да тых, хто практыкуе іншыя вераванні, спараджаюць рэлігійную нецярпімасць ды акты насілля і запалохвання, скіраваныя на рэлігійныя меншасці. Суполка Ахмадыя па-ранейшаму сутыкалася з афіцыйнай забаронай практыкі сваёй веры. Законы супраць зневажання бога прадугледжваюць пакаранне смерцю за ганьбаванне ісламу і яго прарокаў,

пажыццёвае зняволенне за абразы, нанясенне шкоды і зневажанне Карану ды 10 гадоў турмы за знявагу рэлігійных пачуццяў грамадзян. Гэтыя законы часта выкарыстоўваюцца для застрашвання мусульман-рэфармістаў, сектантаў і рэлігійных меншасцяў або для звядзення асабістых рахункаў. “Правілы Худуд” навязваюць элементы закона Карана мусульманам і немусульманам, а таксама розныя афіцыйныя стандарты для мужчын і для жанчын. Рэлігійныя лідэры, што прадстаўляюць шэсць найбуйнейшых шыіцкіх і суніцкіх груп краіны, выпусцілі ў траўні 2005 года рэлігійную судовую забарону на насілле супраць немусульман і на іх забойства. Тым не менш, за выключэннем Федэральных адміністратыўных паўночных раёнаў, сітуацыя з насіллем супраць сектантаў не змянілася, што прывяло да больш чым 110 смерцяў за справаздачны перыяд. Пад ціскам урада многія лідэры Мутахіда Маджліс-і-Амаль, кааліцыі праісламскіх палітычных партый, якая ўзначальвае апазіцыю ў Нацыянальным сходзе, прадпрымалі разнастайныя міжканфесійныя спробы садзейнічаць пашырэнню цярпімасці ў адносінах да рэлігій. Антыахмадскія і антысеміцкія выпады не суніміліся, хоць ад ісламскіх прыхільнікаў Ага Хана ў значнай ступені адступіліся. Урад працаваў з памяркоўнымі рэлігійнымі лідэрамі з мэтай арганізацыі праграмы па ўсталяванні згоды паміж сектамі ды разумення паміж рэлігіямі, забяспечваў забарону і актыўна намагаўся стрымаць дзейнасць сектанцкіх і тэрарыстычных арганізацый, ажыццяўляючы рэгістрацыйную праграму для ісламскіх рэлігійных школ, вядомых як мадрэсэ, і працягваў праводзіць рэформу праграмы народнай адукацыі, створанай, каб спыніць навучанне рэлігійнай нецярпімасці. 1 ліпеня 2006 года прэзідэнт Мушараф загадаў Савету па ісламскай ідэалогіі падрыхтаваць выпраўлены “Правілы Худуд”, які выключаў дыскрымінацыйныя адносіны да жанчын і меншасцяў не пазней чым у жніўні 2006 года. Акрамя таго, прэзідэнт загадаў вызваліць усіх жанчын, затрыманых згодна з цяперашнім указам. Па інфармацыі мясцовых недзяржаўных арганізацый, прыкладна 7000 жанчын было адпушчана на волю.

Расія

Значная бальшыня насельніцтва мела магчымасць свабодна адпраўляць рэлігійныя абрады. Аднак некаторыя супрацоўнікі федэральных устаноў прадпрымалі дзеянні, якія выклікалі заклапочанасць у адносінах паслядоўнасці і пільнасці ўрада Расіі ў справе абароны свабоды веравызнання. Акрамя таго, некаторыя мясцовыя і рэгіянальныя ўлады, спасылаючыся на палажэнні заблытанага Закона аб веравызнанні 1997 года, абмяжоўвалі дзейнасць шэрагу мінарытарных рэлігійных груп. Вынесенае ў 2004 годзе судовае рашэнне, якое забараняе дзейнасць Сведкаў Іеговы ў Маскве, працягвала ў справаздачны перыяд аказваць значны негатыўны ўплыў на дзейнасць гэтай рэлігійнай групы. Назіраліся прыкметы таго, што спецслужбы, уключна з Федэральнай службай бяспекі (ФСБ), былі ўсё больш схільныя лічыць кіраўніцтва шэрагу рэлігійных меншасцяў пагрозай бяспецы. Адносіны народа да традыцыйна мусульманскіх этнічных груп у многіх рэгіёнах былі негатыўнымі, а таксама мелі месца праявы антысемітызму і варожасці ў адносінах да каталікаў і іншых неправаслаўных канфесій. Некаторыя мусульмане, што строга выконваюць рэлігійныя абрады, скардзіліся на тое, што іх праследуюць

за веру. Па-ранейшаму адбываліся выпадкі насілля на рэлігійнай глебе, хоць часта было цяжка вызначыць, ці мелі месца праявы насілля матываваны пераважна ксенафобскімі, рэлігійнымі або этычнымі забабонамі. Некаторыя расійскія праваслаўныя святары публічна выказваліся супраць любога пашырэння присутнасці католікаў, пратэстантаў і іншых неправаслаўных канфесій. Прэзідэнт і ўрад Расіі хутка адрэагавалі на напад на адну з маскоўскіх сінагог у студзені 2006 года, асудзіўшы гэты акт.

Саудаўская Аравія

Іслам з'яўляецца афіцыйнай рэлігіяй краіны, і закон патрабуе, каб усе грамадзяне былі мусульманамі. Урад не прызнае афіцыйна, не абараняе свабоду веравызнання і жорстка абмяжоўвае яе на практыцы. Публічная практыка немусульманскіх рэлігій забараняецца. У палітычных мэтах улады пацвярджаюць, што гарантуюць і абараняюць права на асабістае набажэнства для ўсіх, уключна з немусульманамі, якія збіраюцца дома для рэлігійнай службы, тым не менш, гэта права не заўсёды паважалася на практыцы і не абаранялася законам. Падчас справаздачнага перыяду ўлады прадэманстравалі і пацвердзілі сваю палітыку ў гэтым аспекце ў дачыненні да рэлігійнай практыкі і талерантнасці ў шэрагу ключавых раёнаў. Урад працягваў кампанію супраць рэлігійнага экстрэмізму, і вышэйшыя прадстаўнікі дзяржавы на чале з каралём няспынна заклікалі да памяркоўнасці. Паступалі звесткі, што некаторыя імамы падчас пятнічных казаняў заклікалі ўсіх грамадзян прадэманстраваць павагу да іншых рэлігійных вераванняў, аднак таксама паступала інфармацыя пра публічнае асуджэнне афіцыйнымі асобамі дзяржавы немусульманскіх рэлігій, а таксама шыіцкага адгалінавання ісламу. Урад насаджаў строга кансерватыўную інтэрпрэтацыю суніцкага ісламу, і мусульмане, што не прытрымліваліся яе, сутыкаліся са значнай дыскрымінацыяй у грамадстве і сур'ёзнымі наступствамі з боку мутаваін (рэлігійная паліцыя, афіцыйна вядомая пад назвай Камісія па падтрымцы дабрачыннасці і папярэджанні пароку). Па-ранейшаму паступалі паведамленні пра выпадкі праследавання немусульманскага і суніцкага мусульманскага насельніцтва, у тым ліку напады на прыватныя дамы і затрыманні немусульман за рэлігійныя парушэнні, такія як валоданне немусульманскай літаратурай і правядзенне немусульманскіх рэлігійных службаў, аднак у гэтым годзе такіх паведамленняў паступала менш, чым у мінулым. Паводле асобных  сведчанняў, адбылося скарачэнне як доўгатэрміновых, так і кароткатэрміновых затрыманняў, а таксама арыштаў і дэпартацый немусульман. Аднак былі таксама паведамленні пра тое, што мутаваін вырашылі арыштаваць і дэпартаваць шэраг немусульманскіх рэлігійных лідэраў і актывістаў немусульманскіх рэлігійных груп. Многія немусульмане працягвалі адпраўляць набажэнства пад страхам праследавання і такім чынам, каб схавацца ад паліцыі ды мутаваін. Члены шыіцкай меншасці па-ранейшаму сутыкаліся з палітычнай, эканамічнай, юрыдычнай, сацыяльнай і рэлігійнай дыскрымінацыяй, у тым ліку з дыскрымінацыяй пры паступленні на працу, слабой прадстаўленасцю ў афіцыйных органах, абмежаваннем практыкі сваёй веры, будаўніцтва мячэцяў ды абшчынных цэнтраў. Тым не менш, урад рабіў захады для паляпшэння клімату і цярпімасці ў адносінах да іншых рэлігій, а таксама ў межах самаго ісламу. У снежні 2005 года

кароль Абдула правёў саміт міністраў Арганізацыі ісламскай канферэнцыі, адкрыўшы яго заклікам да памяркоўнасці, цярпімасці, адмовы экстрэмісцкага насілля і рэформы адукацыйных праграм (у тым ліку кніг і адукацыйных планаў). Улады ўдакладнілі, што яны будуць працягваць перагляд адукацыйных матэрыялаў, каб прыбраць зневажальную інфармацыю пра іншыя рэлігійныя традыцыі, і перавучваць або прыбіраць імамаў, у чыіх рэлігійных казанях прапагандуецца экстрэмісцкая рэлігійная думка.

Шры Ланка

Паводле Канстытуцыі, будызм займае "першае месца", аднак не расцэньваецца як дзяржаўная рэлігія. Хоць урад публічна пацвярджае права прадстаўнікоў розных вераванняў свабодна практыкаваць сваю рэлігію, але на практыцы ў некаторых раёнах існавалі праблемы. Заканадаўства супраць пераходу ў іншыя рэлігіі, упершыню прадстаўленае ў 2004 годзе, усё яшчэ знаходзіцца на стадыі абмеркавання. Насуперак збольшага таварыскім адносінам паміж прадстаўнікамі рознай веры, існаваў таксама няспынны моцны супраціў дзейнасці некаторых будысцкіх і хрысціянскіх цэркваў, у прыватнасці той, што ажыццяўляецца евангелісцкімі групамі. Мелі месца паасобныя атакі на хрысціянскія цэрквы з боку будысцкіх экстрэмістаў і пэўная сацыяльная напружанасць у сувязі з няспыннымі абвінавачаннямі  ў прымусовым пераходзе ў іншую веру і дэбаты пра заканадаўства, што забараняе такі пераход.

Судан

Часовая нацыянальная Канстытуцыя, прынятая ў 2005 годзе, гарантуе свабоду веравызнання на тэрыторыі ўсёй краіны, і цягам справаздачнага перыяду назіраліся некаторыя паляпшэнні сітуацыі з павагай да свабоды веравызнання. Тым не менш, рэгіянальныя адрозенні ў Канстытуцыі, якія абмаркоўваліся як частка Усеагульнага пагаднення аб міры, прывялі да няроўнасці ў адносінах да рэлігійных меншасцяў на поўначы і на поўдні краіны. Часовая нацыянальная Канстытуцыя ахоўвае шырыят як крыніцу заканадаўства ў штатах за межамі паўднёвага Судана, аднак прызнае "народны кансенсус" і "каштоўнасці ды звычаі народаў Судана з улікам іх традыцый і рэлігійных вераванняў" як крыніцы заканадаўства на поўдні. Улады паўднёвага Судана ў асноўным паважалі правы хрысціян і мусульман у 10 штатах на поўдні, як гэта і было запісана ў іх асобнай Часовай Канстытуцыі, прынятай 5 снежня 2005 года, аднак новы Урад нацыянальнага адзінства працягваў абмяжоўваць дзейнасць хрысціян на поўначы краіны, асабліва адмаўляючы ў дазволе на выкарыстанне будынкаў пад цэрквы. Урад нацыянальнага адзінства патрабаваў, каб усе вучні на поўначы краіны вывучалі ў школах іслам, незалежна ад таго, ці з'яўляюцца яны мусульманамі, нават пры залічэнні ў прыватныя хрысціянскія школы. Часовая нацыянальная Канстытуцыя  заклікала да стварэння ў сталіцы Хартум Камісіі па правах немусульман, каб абараніць немусульман ад непрыязных адносін да іх у сувязі з прымяненнем там шырыяцкага закону, аднак гэтага так і не адбылося да канца перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай. Цягам справаздачнага перыяду стасункі паміж рэлігійнымі групамі палепшыліся.

Дыялог паміж хрысціянскімі і мусульманскімі групамі працягваўся пад апекай Суданскай міжрэлігійнай недзяржаўнай арганізацыі, што падтрымлівалася Урадам нацыянальнага адзінства і Суданскім саветам цэркваў, што складаўся з каталіцкіх, праваслаўных і пратэстанцкіх груп. Суданскі міжрэлігійны савет разам з Інстытутам міру ЗША ў ліпені 2005 года падтрымаў намаганні хрысціян і мусульман па дасягненні міра і згоды, праспансаваўшы канферэнцыю, прысвечаную ролі рэлігійных лідэраў у мірным будаўніцтве.

Туркменістан

Канстытуцыя прадугледжвае свабоду веравызнання і не вызначае якую-кольвечы дзяржаўную рэлігію, але на практыцы ўрад працягваў кантраляваць усе формы рэлігійнага самавыражэння. Аднак сітуацыя з павагай уладаў да свабоды веравызнання цягам справаздачнага перыяду палепшылася. Савет па справах рэлігій пры ўрадзе краіны быў у большай ступені гатовы дапамагаць рэлігійным меншасцям ва ўрэгуляванні канфліктаў з іншымі дзяржаўнымі органамі. 20 кастрычніка 2005 года шэраг урадавых агенцтваў правялі круглы стол з лідэрамі зарэгістраваных рэлігійных груп для абмеркавання парадку рэгістрацыі філіялаў рэлігійных груп і іншых сумежных пытанняў, што выклікаюць заклапочанасць. У справаздачны перыяд урад Туркменістана ўвёў часовы парадак рэгістрацыі філіялаў зарэгістраваных рэлігійных груп, што размяшчаліся за межамі сталіцы краіны горада Ашхабада. Аднак гэты парадак быў недастаткова ясным, а яго выкананне супрацоўнікамі дзяржаўных органаў – недастаткова паслядоўным. Урад Туркменістана абмежаваў дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных кангрэгацый, забараніўшы ім публічна збірацца, звяртаць у сваю веру і распаўсюджваць рэлігійныя матэрыялы. Дзяржаўныя служачыя за межамі сталіцы часта інтэрпрэтавалі закон больш строга, чым іх калегі ў Ашхабадзе. Хоць узровень праследавання зарэгістраваных рэлігійных груп працягваў зніжацца, бальшыня незарэгістраваных груп па-ранейшаму з’яўляліся аб’ектам праследавання з боку ўладаў, што выражалася ў затрыманнях і арыштах іх членаў, канфіскацыі рэлігійнай літаратуры ды матэрыялаў, ціску з мэтай прымусіць адрачыся ад рэлігійных поглядаў і пагрозах звальнення і высялення. Паступалі паведамленні пра ганенні за рэлігійную веру або прытрымліванне рэлігійных святаў, а ў шэрагу выпадкаў людзей затрымлівалі для допыту ў сувязі з выкананнем імі рэлігійных абрадаў. З мэтай зрабіць дзяржаўны кантроль за мячэцямі больш жорсткім, урад Туркменістана замяніў некалькіх імамаў з ліку мусульман-сунітаў грамадзянамі, вядомымі сваёй меншай незалежнасцю ў інтэрпрэтацыі ісламу.

Узбекістан

За перыяд, ахоплены справаздачай, сітуацыя са свабодай веравызнання пагоршылася. Канстытуцыя прадугледжвае свабоду веравызнання, аднак урад працягваў абмяжоўваць гэтае права на практыцы. Улады дазваляюць дзейнасць ухваленых мусульманскіх і еўрапейскіх груп, рускай праваслаўнай царквы і іншых разнастайных хрысціянскіх канфесій, такіх як каталікі, лютэране ды баптысты. Закон забараняе або жорстка абмяжоўвае такія віды дзейнасці, як зварот у сваю

веру, увоз і распаўсюджанне рэлігійнай літаратуры, а таксама прыватнае выкладанне рэлігіі. Шэраг мінарытарных рэлігійных груп, у тым ліку кангрэгацыі розных хрысціянскіх канфесій, сутыкаліся з цяжкасцямі пры выкананні строгіх рэгістрацыйных патрабаванняў, усталяваных законам. З’явілася некалькі паведамленняў пра тое, што хрысціянскім кангрэгацыям было адмоўлена ў рэгістрацыі па надуманых тэхнічных прычынах. Як і ў папярэднія гады, пратэстанцкія групы, членамі якіх з’яўляюцца этнічныя ўзбекі, паведамлялі пра тое, што яны вымушаны дзейнічаць у абстаноўцы праследаванняў і страху. Супрацоўнікі праваахоўных органаў здзяйснялі аблавы і праследавалі пэўныя зарэгістраваныя групы, некаторыя з якіх былі выкрэслены са спісу зарэгістраваных і зачынены. Урад працягваў сваю кампанію супраць недазволеных ісламскіх груп, што падазраваліся ў экстрэмісцкіх настроях або экстрэмісцкай дзейнасці, арыштоўваючы мноства меркаваных членаў гэтых груп і прыгаворваючы іх да парцяглых тэрмінаў пазбаўлення волі. Паводле меркаванняў, сярод іх было нямала членаў забароненага ісламскага палітычнага руху “Хізб ут-Тахрыр”. Многія іншыя былі кансерватыўнымі мусульманамі, рэлігійныя погляды або вучэнні якіх разыходзіліся з тымі, якіх прытрымліваліся святары, чыя дзейнасць была ўхвалена дзяржавай. Урад аказваў ціск на забароненую ісламскую групу “Акрамія” (“Акраміялар”), асабліва ў Ташкенце ды Андыжане. Гэтыя дзеянні ў выніку прывялі да насілля і смерці людзей у Андыжане ў траўні 2005 года. Невялікая, аднак растучая колькасць “падпольных” мячэцяў дзейнічала пад пільным наглядам рэлігійных уладаў ды службаў бяспекі. Мячэці, што працавалі без рэгістрацыі, з’яўляюцца нелегальнымі і могуць дзейнічаць толькі з дазволу мясцовых органаў улады.

Вьетнам

У цэлым павага да свабоды веравызнання ў Вьетнаме падчас справаздачнага перыяду вырасла. І Канстытуцыя, і закон прадугледжваюць свабоду набажэнства, тым не менш, урад працягваў абмяжоўваць арганізаваную дзейнасць рэлігійных груп, якія заявілі аб сваім разыходжанні з дзяржаўнымі законамі і палітыкай. Урад рабіў спробы рэгуляваць рэлігійную практыку ў межах закону, асновай якога была Пастанова аб рэлігіі і веры 2004 года, якая патрабавала, каб улады афіцыйна санкцыянавалі арганізацыю і дзейнасць рэлігійных канфесій. Шэраг прагрэсіўных заканадаўчых рэформ, здзейсненых у апошнія гады, заставаліся на ранніх стадыях ажыццяўлення. Дэкрэт ў выкананне Пастановы акрэслівае ўсталяваныя правілы для таго, каб рэлігійныя канфесіі зарэгістравалі сваю дзейнасць і шукалі афіцыйнае прызнанне. “Інструкцыя па пратэстантызме” 2005 года, абвешчаная прэм’ер-міністрам, прадпісвае афіцыйным асобам аказваць садзеянне непрызнаным пратэстанцкім групам у рэгістрацыі іх дзейнасці для таго, каб яны маглі адкрыта ажыццяўляць рэлігійную практыку. Інструкцыя таксама заклікае вьетнамскія ўлады прадставіць месца для набажэнства не перыяд працэсу рэгістрацыі. Пратэстанцкія вернікі з Цэнтральнага Узвышша паведамлялі пра значнае паляпшэнне ў іх становішчы. Больш за тое, урад пачаў садзейнічаць рэгістрацыі пратэстанцкіх хатніх цэркваў у паўночным Вьетнаме і ў рэгіёне Паўночна-Заходняга Узвышша, аднак прагрэс быў марудным і вьетнамскі ўрад зазначыў, што толькі шасці раней

незарэгістраваным паўночным кангрэгацыям было дазволена юрыдычна зарэгістраваць сваю дзейнасць цягам справаздачнага перыяду. За выключэннем некалькіх пацверджаных паведамленняў пра паліцэйскае праследаванне і збіццё прадстаўнікоў незарэгістраваных рэлігійных груп, пратэстанты на поўначы краіны паведамлялі пра змены да лепшага ў адносінах большасці афіцыйных асоб да рэлігійнай практыкі. І ў цэлым пратэстанты збіраліся для малітвы, не адчуваючы на сабе сур'ёзных праследаванняў. Абмежаванні іерархічнай сістэмы духавенства некаторых рэлігійных груп працягвалі мець месца,  вьетнамскі ўрад адыграваў значную ролю ў наглядзе за прызнанымі рэлігіямі. Рэлігійныя лідэры зведвалі найбольшыя абмежаванні, калі прымалі ўдзел у дзейнасці, якую ўлады ўспрымалі як палітычную або як выклік свайму кіраванню. Урад Вьетнама працягваў забараняць і актыўна перашкаджаў удзелу ў адной непрызнанай фракцыі будыстаў Хоа Хао. Улады таксама актыўна абмяжоўвалі кіраўніцтва непрызананай Аб'яднанай будысцкай царквы Вьетнама і сцвярджалі, што не прызнаюць арганізацыю пры яе цяперашнім кіраўніцтве. Каталіцкая царква паведамляла, што ўрад працягваў некаторыя абмежаванні пры прызначэнні новых духоўных асоб царквы, але зазначала, што хацела б адкрыць дадатковыя семінарыі на поўначы краіны. Цягам перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай, урад выпусціў чатырох вядомых вязняў, якія, паводле розных крыніц, былі пазбаўлены волі за рэлігійную дзейнасць.

Выпушчана ў верасні 2006 года